# СОФ'Я ДЗЯДЗЮК



## Ажынавы маяк

Экспрэсіўная акварэль

Дзядзюк Соф'я нарадзілася 26 снежня 2003 года ў аграгарадку Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна. З пачатковай школы займаецца музычнай і літаратурнай творчасцю, напісаннем апавяданняў, вершаў і песень. У сярэдняй школе была ўдзельнікам мясцовага літаратурнага гуртка і творчых конкурсаў, друкавалася. Цяпер студэнтка трэцяга курса Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарных навук.

Я адчуў ледзь улоўны пах марской солі, адчуў яе асадак на языку, глотцы і паспрабаваў праглынуць. Не атрымалася. Я чуў шум хваляў, якія бязлітасна разбіваліся аб вострыя шурпатыя камяні на ўзбярэжжы, на якім я зараз і знаходзіўся. Хаця адкуль мне ведаць? Я зусім не памятаю, як сюды трапіў, прыйшоў сам ці мяне прывезлі. Не ўяўляю, дзе ўвогуле на Зямлі знаходзіцца гэтае месца і ці ведае пра яго хто-небудзь, акрамя мяне.

Я і не памятаю, хто сам ёсць такі. Ды і мора не бачу, магу толькі здагадвацца, што яно ёсць, адчуваць характэрны пах, чуць шум і жаласныя крыкі чаек, якія патрулююць неспакойную роўнядзь вады ў пошуках рыбы.

Мяне акружаюць халодныя сцены, нечакана не афарбаваныя ў сляпуча белы колер. Яны цьмяныя, крыху выцвілыя, колеру ажынавага соку. Яны трымаюць мяне ў сярэдзіне будынка, пазбавіўшы магчымасці сысці ці збегчы. Яны кінулі мяне аднаго з адзіным напамінам аб рэальным свеце ў выглядзе патрапанага, трохі пажоўклага буклета, які інфармуе аб хуткім канцэрце велічнага аргана з залацістымі масіўнымі трубамі.

І нават зусім нічога не разумеючы і не памятаючы, унутрана я чамусьці вельмі знерваваўся і засмуціўся, нібы мне паведамілі непрыемную навіну. Напэўна, я проста зажурыўся праз усведамленне, што гэтую самую «музыку» маё нутро ніколі не спазнае, струны душы не нацягнуцца ад захаплення, уласцівага чалавеку, які ведае, што гэта «музыка». У вачах не прабяжыць галодная іскра ад пачуццяў і эмоцый, якія тармозяць дзесьці ў глыбіні матэрыяльнай абалонкі з костак, мышцаў і крываноснай сеткі нешта па-сапраўднаму жывое. А адкуль мне ведаць, што робіць з целам «музыка»? Не памятаючы нічога, разумею яе

інтуітыўна? Быццам я нарадзіўся з неабходнымі ведамі ў глыбіні галавы, недзе ў зоне паміж вушамі.

Гарката разлілася па венах, падкаціла да вачэй, якія стала непрыемна калоць, і яны намоклі. Скразняк, які адчуваўся тут з моманту майго з'яўлення, як маці з нованароджаным дзіцем, зараз непрыемна рэзаў вочы.

Я міргнуў, тут жа скідаючы з сябе адчуванне раздражнення і холаду ў размытай рэальнасці. Стала лепш, але пальцы ўсё роўна ў нейкай роспачы сціскалі няшчасны буклет, як калі б гэта дапамагло намацаць арганную музыку. На жаль, гэта не працуе. Нават не ведаючы нічога аб тым, хто і адкуль, я выдатна гэта ўсведамляю. Прымаю пакорліва і раблю першы крок наперад.

Перада мною патрапаная, старая, месцамі расколатая часам і душным марскім паветрам спіраль лесвіцы, канец якой ішоў кудысьці наверх. Не маючы парэнчаў, за якія варта трымацца на звыклых сходах дзесьці ў дамах, сцены тут былі вузкімі, сціскалі прыступкі шчыльна з двух бакоў, як ціскі. Аднак мяне вабіла падняцца і спазнаць, што наверсе. Можа, там сапраўды нешта ды матэрыялізуецца, як толькі мая істота стане на апошнюю прыступку.

Ногі чуліся жудасна цяжкімі, плечы стуліліся, занылі, быццам на мяне накінулі жорсткі і вялікі мяшок з мукой, якая казыча ноздры. Непрыемна. Але я прымусіў сябе разагнуць спіну, зрабіць крок, каб не заставацца на месцы. Яшчэ крок. І яшчэ адзін. Ногі ўжо не ступалі па роўнай, шурпатай і пыльнай падлозе, а нетаропка і акуратна паднімалі мяне вышэй ад пачатку лесвіцы, набліжаючы паступова да яе канца, калі ён усё ж існаваў. А ці існаваў? Я нават спыніўся, уражаны такой раптоўнай думкай. Сапраўды, ці ёсць увогуле канец лесвіцы? Ці ёсць сэнс паднімацца далей? У горле непрыемна запяршыла, ажынавыя цагляныя сцены заскакалі ў вачах. Не, на месцы заставацца не трэба. Рухацца, ісці наперад, нават калі лесвіца бясконцая! Інакш цела парасце мохам, вантробы і косткі аплятуць мясістыя мёртва-бледныя грыбы, якія сілкуюцца рэшткамі жыцця, пыл уесца ў скуру і навекі стане яе часткай. Гэтая непажаданая будучыня не для мяне! Ва ўсякім разе, не цяпер, калі мае мышцы ўсё яшчэ працуюць, пхаючы цела наперад, галава яшчэ разважае, думае, вушы ўсё яшчэ могуць чуць ціхі шум мора, а вочы — бачыць гэтыя цагляныя сцены, афарбаваныя ў колер раздушаных, перамолатых ажынавых ягад. Нават язык усё яшчэ здольны адчуваць прысмак саленаватага марскога паветра. Спыняцца нельга! Сэнс ёсць толькі ў руху па драбiністай спіралі. Яшчэ крок. І яшчэ адзін. Рухацца, ісці наверх! Па скуры нават прабеглі дрыжыкі, хоць да гэтага мне было зусім не холадна. Ды і цеплыні я не адчуваў... А магчыма, што больш падобна на праўду, я проста не надаваў гэтаму ніякай увагі.

Валасы на патыліцы злёгку прыўзняліся, нібы іх ашаламіла ледзяное паветра, такое непадобнае на тое душнае і марское, якое адчувалася зусім нядаўна. Што гэта? Што за трывожнае пачуццё? Чаму раптам нешта ўнутры пад рэбрамі сціснулася, забулькатала, а ў роце з'явіўся непрыемны прысмак? Чамусьці мяне стала хваляваць разуменне, што як толькі я прасунуся на адну прыступку наперад, пройдзены мною шлях адразу ж схаваецца за дымчатай цемрай, нібы зусім знікне. І варта толькі зрабіць крок назад, як маё цела праваліцца ў скрушлівы змрок, а ногі адчуюць пад сабой толькі пустэчу і не змогуць абаперціся на прыступкі, якія, здавалася б, павінны былі стаць для цела апірышчам. Моцны страх скаваў мяне, не дазваляючы павярнуць галавы і паглядзець за спіну. Цяпер шляху назад сапраўды няма. Як калі б мяне гэта магло супакоіць, я сціснуў буклет у руцэ мацней, і нават стала сорамна: ён зараз, напэўна, быў яшчэ больш скамечаны, чым быў да гэтага. Захацелася папрасіць прабачэння, быццам папера была жывой, але я не стаў. Пастараўся забыць усё і перастаць так шмат разважаць, зноў прымусіў сябе ісці наперад. Спакуса паглядзець за спіну не павінна мяне адцягваць.

# МАРЫЛЯ БУЙНА



## Зоры, ветах і сэрца ў размаху матора

Вершы

Марыля Буйна нарадзілася 5 верасня 2004 года ў Гомелі. Скончыла гімназію № 56 г. Гомеля. Цяпер студэнтка філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

✦ ✦ ✦

калі мне ёсць месца побач цябе, Артэміда,
дазволь сесці ля твайго трона
і ззяць зоркай
вечна яркай,
цнатлівай,
адданай.
а калі я памылюся —
пусці мяне
ці пусці ў мяне
стралу.

### Гордзіеў вузел

я скручуся ў гордзіеў вузел,
і ніхто мяне не разрэжа.
я не песня
і не муза —
толькі човен ля ўзбярэжжа.

я скручуся, і цар ніякі
не асмеліцца кінуць выклік.
я не глеба;
і ўяўны якар
мне не зробіць нікога звыклым.

я спяваю
трэскамі хвоі,
і не трэба мне лірнік-вандроўнік.
я не волат, але й не хворы.
і сама я сабе дарога.

я скручуся ў гордзіеў вузел,
і ніхто мяне
не разрэжа.

### Тантал

таптаў
Тантал
бераг
белы —
лыткамі
лашчыў
ваду.

# КАЦЯРЫНА МІЗЕРЫЯ

## Іду за зоркай сваёю

Вершы



Мізерыя Кацярына нарадзілася 9 лютага 2002 года ў Брэсце. Скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Працуе рэдактарам. Вершы друкаваліся ў газетах «Кобрынскі веснік», «Зара», «Літаратура і мастацтва», часопісах «Маладосць», «Астрамечаўскі летапіс» і калектыўным зборніку «Берасцейская скарбніца». Лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу творчай моладзі «Аўтограф» і Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў «Берагі сяброўства», дыпламант міжрэгіянальнага паэтычнага конкурсу «Браслаўская обитель».

### Іду, не спыняючы крокаў

Іду, не спыняючы крокаў,
За марай сваёй невядомай.
Ў душы адчуваю палёгку,
Вярнуўшыся быццам дадому.

Іду за адзінаю зоркай
Сваёю, што свеціць з нябёсаў,
Такой непамерна далёкай —
Адбіткам шчаслівага лёсу.

Іду, свята верачы ў цуды,
У казку, што ў кніжцы чытала,
І я чараўніцаю буду,
Хай пройдзе хвілінаў нямала...

Калісьці лятаць навучуся
На Богам падораных крылах.
Імгненна за ветрам памчуся,
За сонцам, што Муза дарыла.

Мне з гэтага шляху не збіцца,
Не ведаю іншай дарогі.
Каб ў ранішніх словах адбіцца,
Прашу дазвалення ў Бога.

Малюся, каб зорнаю птушкай
Лятаць змагла з ветрам і хмарай,
Свой след пакідаючы стужкай —
Адбіткам чароўнае Мары.

### Я веру...

Я веру... Ты побач, ты побач са мною,
Кіруеш нябачна маёю рукой.
Ты побач і летам, і снежнай зімою,
Калі ўсе пачуцці ліюцца ракой.

Я веру.... Заўсёды мяне падтрымае
Адзіная зорка, што бачу з нябёс.
Святло, як святыню, у сэрцы трымаю,
Прымаю анёлам падораны лёс.

Я веру... Калісьці яна адгукнецца,
З-за хмараў узыдзе калісьці яна.

# Я ТАК ЖЫВУ...

## Віталія Глаз



### Скрыжаванне

Калі жывеш на Скрыжаванні
Дарог, гасцінцаў і сцяжынак —
У галаве адны пытанні:
Куды? Чаму? Каму павінны?

Калі ідзеш па Скрыжаванні
Культур, паняццяў, думак, часу —
Шануй ўсе веры, ўсе паданні,
Сваё ж не пакідай ні разу.

Калі сядзіш на Скрыжаванні,
А мэта стаяла ў туманах,—
Ты не спыняйся ў разважанні,
Каб не заблытацца ў падманах.

Калі глядзіш на Скрыжаванне,
А над табою зоркі свецяць,—
Міжволі марыш аб спатканні
З вíруючым жывым Сусветам.

Калі твой лёс — на Скрыжаванні,
А ўсё не разумецьмеш, хто ты,—
Не засмучайся, будзь барвенкам[1],
Усе адказы знойдзеш потым.

Калі прылёг на Скрыжаванні
І не захочацца прачнуцца —
Маліся шчыра й вер: у бяссмерці
Твае карэнні апынуцца.

---

[1] Барвенак — вечназялёная расліна, невысокая, учэпістая, разрастаецца дыванам. Сустракаецца ў міфалогіі, лічыцца магічнай.

## Святлана Цмугунова



### Мне звыкла так

Мне звыкла так глядзець ў сваё акенца,
Як замятае снег ліхтарны слуп.
І мне тады аднолькава здаецца,
Што гэта зграйкі белых мух.

Як ён садзіцца ціха на сцяжынку,
Бліскае жоўтым, потым залатым.
Як сапраўды падобна на дзяўчынку
Бярозка сціплая пад ім.

Мне звыкла вуліца ў таполях,
Лясок, што выплыў у далі,
Пагоркі тыя, што на полі
Ляжаць, як быццам камяні.

Жадання іншага не маю,
Таму і зрок я не адводжу:
Я так жыву, так спачываю,
Калі ў акенца пагляджу.

# Я ТАК ЖЫВУ...

## Маргарыта Стрыевіч



### Парада на заўтрашні дзень

Сюжэт для вечнасці ў нататнік замалюй.
Забудзь пра тлум будзённы на імгненне.
Тады адчуеш, шпарка як бягуць
Пражытыя твае гады — праз церні...

Дзве тысячы ідэй заўсёды ходзяць побач,
Чмураць, раяцца, тлумяць галаву.
Ды сярод іх ёсць вартыя, напэўна!
Твая задача — ухапіць адну.

Таму, шаноўны дружа, бачыш зоры?
Дык вось, яны падкажуць добры шлях.
А ты адкінь усе свае сумневы,
Ідзі-ляці да мары, нібы птах.

Каб гэты дзень не знікнуў шэрым ценем,
Пот плённай працы ураджай прынёс,
Ты вочы завяжы, каб не баяцца цемры,
І кроч наперад, у свой лепшы лёс!

## Варвара Суравец



✦ ✦ ✦

Я адчуваю моцную нуду,
Душы маёй парушаная мель...
Праходзіць, быццам сон, павольна дзень,
І вечар ў сэрцы адгукаецца трывогай.
На самай справе, разумею я,
Што у жыцці маім з пракладзенай дарогай
Штосьці не так, але не бачу што...
І гарызонту не кранецца мне рукой.
Мой шлях — з выбоінамі сцежка.
Мой дом — ад дзічкі ля арэляў пень.
І кожны шорах днём — пустыя ноты,
І кожны ўноч абрыс — уяўны цень.

✦ ✦ ✦

Пакою час ды цемра ночы...
І нават ў ёй я бачу шыр —
Скрозь вокны б'ецца прама ў вочы
Яскравых шыльд няяўны флірт.

Заплюшчу вочы — бачу: крочу
І шлях галіністы вядзе,
Адкрыю — белы столь рагоча
Над сіняй цяжкасцю павек.

Абдымкі коўдры нагадаюць
Пра адзіноту, як ў глушы.
Чаму ж увечар ўспамінаю,
Даўно шчыміць што на душы?

Фота з архіва аўтараў

ЗНАКІ ЭПОХІ

# УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

## Сонца апошняга дня

Апавяданне

*Сярод выяўленых у аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі матэрыялаў ёсць некалькі няскончаных апавяданняў Уладзіміра Караткевіча. Рукапіс апавядання на шасці старонках «Сонца апошняга дня» захоўваецца ў ф. 11, воп. 2, адз. зах. 209. Час напісання, хутчэй за ўсё,— канец 1950-х — пачатак 1960-х гадоў, час дзеяння ў творы — пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны, акупацыя Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі.*

*Цяжка вызначыць далейшую сюжэтную лінію апавядання, але выяўляецца галоўнае: дырэктара Марціна Нарожыка турбуе лёс тых чатырохсот выхаванцаў, якім «няма куды ісці». І клапатлівы настаўнік ідзе на сустрэчу з гебітскамісарам, спадзеючыся на лепшае. Кароткая гутарка з былым вучнем Алесем Шведам як бы падказвае, што настаўнік не здолее нічога дабіцца, яго чакае трагічны лёс, але ён застанецца годным абаронцам сваіх «дзяцей» — выхаванцаў...*

*Друкуецца ўпершыню.*

Ён паклаў у саквояж зубную шчотку, хоць ведаў, што скарыстацца ёю зможа толькі адзін раз. І яшчэ — пару бялізны, хоць змяніць яе — ён ведаў — яму не давядзецца.

Прывычка была вышэй за ўсё.

Потым ён выпраміўся над саквояжам і з уздыхам агледзеў пакой.

Усё было як раней. Нават мармуровая копія паміраючай амазонкі ўсё так жа цягнулася кудысьці саслабелым целам і подых яе, як сорак год таму, быў толькі на самых кончыках вуснаў.

Амазонку любіла Гелена. Гелены няма ўжо дваццаць год. А ў пакоі, ва ўсёй кватэры ўсё так, як было пры ёй: услончык для ног стаіць каля крэсла і недамотаны клубок каляровай поўсці ляжыць на яе рабочым стале.

Гелена памерла ад родаў. Калі б гэтага не было — у яго быў бы зараз дваццацігадовы сын, уцеха на схіле год. Але сын памёр разам з ёй. Бадай, гэта было лепей, мяркуючы па сённяшнім дні. І ўсё ж сэрца працяў ранейшы жорсткі боль. Дваццаць год ён жыў у пакутах сумлення, бо гэта ён паслаў Гелену на смерць.

Моцна мяне ты любіла,
Моцна цябе я кахаў,
Але давёў да магілы,
Сам на пакуты аддаў.

Страфа ўспомнілася яму як нешта далёкае. Бадай, лепей было, што Гелена памерла тады, разам з хлопчыкам.

Ён пабачыў у цьмяным венецыянскім люстры сябе, з галавы да ног. Моцнага чалавека шасцідзесяці год, шыракаплечага і вузкага ў клубах. Зусім белыя валасы, чорныя бровы, пільны позірк цёмных вачэй, якія так імкнуліся спаймаць дзеці, зрабіўшы нешта добрае.

Гэты позірк перайшоў на прывычныя прадметы гасцінай і потым утаропіўся ў акно, за якім мрэялі ў вясновым празрыстым сонцы шаты ліп. Ліпы абкружалі двор дзіцячага дома, яго дзіцячага дома, які вось ужо трыццаць пяць год быў гонарам усёй Еўропы. Яшчэ пры панах.

Зараз гэты двор быў пусты. Не далятаў з двара смех, не далятаў шум гульні.

АСОБА

# ВЕРАНІКА МАРУК

## Сціплы сябар



*Успаміны мімалётныя. Яны могуць сысці разам з людзьмі, а могуць застацца і прычыняць такую ж боль, як і радасць. Успаміны дачкі пра бацьку інтымныя, шчырыя, напоўненыя цеплынёй і смехам. Уладзімір Марук быў паэтам, перакладчыкам, працаваў у рэдакцыях газет і часопісаў. У гэтым годзе яму магло б споўніцца 70 гадоў. Вераніка, дачка Уладзіміра Антонавіча, распавядае пра свайго тату тое, што ведала толькі яна. І тое, што бачылі многія. Расказвае, не хаваючы сваёй любові і сваіх шкадаванняў. І чалавек, якога ўжо няма, аказваецца рэальным. Вобразам, сатканым са шчымлівых слоў і ўспамінаў.*

Першы ўспамін пра бацьку — гэта нешта далёкае, ледзь улоўнае, але ён моцна ўрэзаўся ў маю памяць. Раніца выхаднога дня, і я — самае шчаслівае дзіця ў свеце, таму што еду ў таты на спіне мыцца. Мне было два гады, але я да гэтага часу памятаю кожную дэталь: паласаты ручнік, грабянец з патрэсканым партрэтам прыгожай жанчыны і халодную-халодную ваду, якой тата мяне ўмываў.

Калі мне споўнілася чатыры гады, бацька стаў браць мяне на працу, тады ён быў галоўным рэдактарам выдавецтва «Юнацтва», і я часта была ў гасцях у рэдакцыі. У дзень, калі мы ішлі туды (ішлі — гэта не проста вобраз, бо бацька ніколі не ездзіў на працу на транспарце, толькі пешшу, узімку і ўлетку), чараўніцтва пачыналася з самай раніцы. Менавіта ён прывіў мне любоў да доўгіх прагулак, калі можна ўбачыць, як сонны горад ажывае і напаўняецца рухам. Потым пачынаўся працоўны дзень: я вучылася друкаваць на машынцы, малявала, гартала кнігі, назірала, як да майго таты прыходзяць па параду, якія ён мае добрыя зносіны са сваімі калегамі, як шмат робіць для таго, каб кожны дзень прыносіў карысць і дабро ўсяму свету. Вядома, усведамленне гэтага прыйшло пазней, але ўспаміны маленькай дзяўчынкі, якая ішла з татам за руку да яго на працу, і тое пачуццё абсалютнага паветранага шчасця застануцца са мной назаўжды.

Яшчэ адзін успамін — гэта, вядома ж, грыбы і рыбалка. Менавіта бацька навучыў мяне зносінам з прыродай, навучыў паважаць навакольны свет, атрымліваць асалоду ад блакітнага неба і яркага сонца. Ён быў заўзятым грыбніком, ведаў усе ўрадлівыя месцы ў акрузе, і я заўсёды была побач. Бачылі б вы, з якім трапятаннем і пяшчотай ён ставіўся да кожнага зрэзанага грыбка! Лес заўсёды адказваў яму падзякай, і мы ніколі не вярталіся дадому з пустымі кошыкамі. Гэтаму ж я зараз вучу майго пяцігадовага сына, які ведае амаль усе грыбы і не прапусціў яшчэ ніводнай рыбалкі.

У кожнага ёсць сваё «месца сілы». Думаю, бацька чэрпаў натхненне і спакой, калі прыязджаў на сваю малую радзіму ў



У Піцундзе на адпачынку з сям'ёй



Віктар Стрыжан, Уладзімір Марук,
Алесь Пісьмянкоў на свяце паэзіі ў Вязынцы



На сямейным свяце з дачкой і сынам

МАСТАЦТВА

# АДАМ ГЛОБУС

## Толя

Словы пра графіка Анатоля Александровіча

### Помнік

Вова Савіч пачаў казаць, што койданаўская лазня — найлепшая ў свеце. На думку Савіча, мужчына мусіць мыцца ў лазні, а не ў нейкай там балеі ці ў бляшаных начоўках. Ісці ў лазню мне не хацелася, пагатоў — у Мінску я любіў раз ці два на тыдзень прыняць ванну. У Койданава мяне і начоўкі задавальнялі, бо на рэчцы купаўся і ў возеры плаваў. Пэўна, я не пацягнуўся б з Савічам у лазню, каб не Толя Александровіч. Менавіта Толя ўгаварыў мяне ўзяць ручнік і пайсці папарыцца. Койданаўская лазня мне страшэнна не спадабалася, бо шматлюдная, цёмная, задушлівая і ўсё ў ёй як у лазні піянерлагернай. Ну хіба парылка крыху прастарнейшая. Што такога адметнага Толя Александровіч у ёй знайшоў? Я так і не зразумеў. Праўда, я сам у ёй знайшоў адну цудоўную якасць. Калі пасля выпарванняў, намыльванняў і памыўкі ты выходзіш з лазні на ганак, дык адчуваеш салодкі смак сапраўднай свабоды. Цяпер, калі ў мяне пытаюцца, які помнік хацеў бы я сабе пасля смерці, я кажу: «Бронзавы голы хлопчык стаіць каля койданаўскай лазні, задраў галаў, глядзіць на зоры і дыхае паветрам свабоды...» Зрэшты, такі помнік можна паставіць усім койданаўскім мастакам... І мне, і Савічу, і Александровічу...

### Котка

Часам здавалася, што Толя Александровіч кіне свае малюнкі і акварэлі, свае палотны і палітры, кіне эцюднікі і планшэты... Кіне мастакоўства і сыдзе ў акторы, пойдзе ў тэатр, пабяжыць на кінастудыю, заляціць у вялікае кіно... Толя захапляўся кіно да самазабыцця, амаль як маляваннем. Праўда, калі ў маляванні Толя меў поспех, дык у кіно так і застаўся гледачом, аматарам, удзельнікам масоўкі... Але кіназахапленне Толі выглядала цікава, бо ён знаёміўся з акцёрамі. Аднойчы ён пазнаёміўся з Аляксандрам Кавалеравым, выканаўцам ролі Мамачкі ў фільме «Рэспубліка ШКІД». Тады Кавалераў служыў у Мінскім тэатры юнага гледача і раз на тры месяцы выступаў у кінатэатры «Піянер» перад паказам «Рэспублікі...». Фільм меў ашаламляльны поспех. Мамачка пад балалайку кранальна выконваў народную песню пра котку:

А у кошки четыре ноги,
Позади у нее длинный хвост...


Анатоль Александровіч з маці. 2000 г.

# КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ

## ГУЛЬНІ ПАДСВЯДОМАСЦІ



*На пластычныя спектаклі складана ісці непадрыхтаванымі. Толькі чалавек з вельмі добрай фантазіяй і ведамі ў мастацтве зможа прыдумаць і раскрыць вобразы, закладзеныя рэжысёрам. Усё ж мова — галоўны, хай і не першы наш спосаб зносін. Беларускі акадэмічны музычны тэатр у 2021 годзе паставіў спектакль «Пад·Свядомасць». У 2024 годзе я вырашыла выпрабаваць сябе і пайсці на яго, не ведаючы пра пастаноўку нічога, акрамя назвы. І вопыт гэты апынуўся куды больш каштоўным, чым можна было ўявіць.*

### Скептыцызм і цялеснасць

У сваім неразуменні таго, што адбываецца на сцэне, я была не адна. У крэсле ззаду сядзела пара — хлопец і дзяўчына. І малады чалавек, відавочна, прыйшоў у тэатр калі не ў першы, то максімум у другі раз. Калі на сцэну выйшлі артысты балета — амаль голыя, у белых бодзі, вельмі ранімыя пад халодным святлом, — ён пагардліва чмыхнуў. Калі артысты пачалі танцаваць — а ці трэба казаць, што кантэмпарары — танец блізкасці з сабой і з уласным целам, — ён пырснуў ад смеху. Артысты выгіналіся на падлозе і ў паветры, а малады чалавек працягваў незадаволена бурчэць.

— ***Я нічога не разумею,*** — казаў ён.

— ***Не абавязкова разумець, проста адчувай,*** — адказвала яго спадарожніца.

А артысты тварылі няўяўнае. У нас у культуры не прынята паказваць сваё цела. Гэта лічыцца чымсьці ганебным, няёмкім, залішне інтымным. Рэжысёр Сяргей Мікель ужо ў выбары нарадаў кідае асновам грамадства выклік. Яго артысты сапраўды часам здаюцца голымі. Белае цела, белая бялізна, белыя прасціны — ад гэтага вее не тое холадам, не тое свабодай. І нават падрыхтаваны глядач часам уздрыгвае ад таго, наколькі адкрытымі здаюцца эцюды, паказаныя на сцэне. Ніякай пошласці, не падумайце. Проста мы не прывыклі бачыць цела не проста інструментам — галоўным героем.